Парадак выкарыстання партала рэйтынгавай ацэнкі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі

Пры арганізацыі работы па выкарыстанні партала рэйтынгавай ацэнкі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі неабходна ўлічваць палажэнні наступных нарматыўна-прававых актаў:

- абзац шосты подпункта 3,5 пункту 3 Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2006 г. № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва» (далей — Дырэктыва № 2);
- Палажэнне аб партале рэйтынгавай ацэнкі, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2019 г. № 765 «Аб партале рэйтынгавай ацэнкі» (далей – Палажэнне);
- Інструкцыю аб парадку функцыянавання партала рэйтынгавай ацэнкі, зацверджаную пастановай Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2019 г. № 19 (далей – Інструкцыя).



Меры па забеспячэнні эфектыўнага выкарыстання партала

- вызначэнне ў дзяржаўным
  органе (арганізацыі) службовых асоб, адказных за рэалізацыю функцый, указаных у пункце 13 Палажэння
- вызначэнне арганізацый, якія падлягаюць рэгістрацыі ў якасці аб’ектаў ацэнкі, або ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў (арганізацый) на партале рэйтынгавай ацэнкі
- інфармаванне грамадзян
  і папулярызацыя партала рэйтынгавай ацэнкі
- унясенне неабходнай і дакладнай інфармацыі ў асабісты электронны кабінет аб’екта ацэнкі, упаўнаважанага дзяржаўнага органа (арганізацыі)
- фарміраванне ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) лакальных рэестраў аб’ектаў ацэнкі
- маніторынг і аналіз эфектыўнасці дзейнасці аб’ектаў ацэнкі, уключаных у лакальны рэестр аб’ектаў ацэнкі ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа (арганізацыі)
- вядзенне ўліку інфармацыі пра якасць аказваемых паслуг

і (ці) пра адміністрацыйныя працэдуры, якія выконваюцца, яе выкарыстанне пры ацэнцы дзейнасці аб'ектаў ацэнкі, а таксама пры правядзенні ратацыі іх кіруючых кадраў
- рэгістрацыя на партале рэйтынгавай ацэнкі

Рэгістрацыя аб'екта ацэнкі, упаўнаважанага дзяржаўнага органа і арганізацыі на партале

Рэгістрацыя ажыццяўляецца:



- **аўтаматычна** пры выкарыстанні для аўтарызацыі электроннага лічбавага подпісу, які вырабляецца з выкарыстаннем асабістага ключа, сертыфікат адкрытага ключа якога выдадзены Рэспубліканскім цэнтрам сертыфікацыі Дзяржаўнай сістэмы кіравання адкрытымі ключамі праверкі электроннага лічбавага подпісу Рэспублікі Беларусь
- **праз зварот** да аператара партала рэйтынгавай ацэнкі (рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Цэнтр лічбавога развіцця») аб прадастаўленні лагіна і пароля

У звароце да аператара парталу рэйтынгавай ацэнкі неабходна ўказаць наступныя даныя:

- рэгістрацыйны нумар (нумар уліку плацельшчыка) і поўную назву арганізацыі
- пасаду, адрас электроннай пошты і кантактны тэлефон асобы, адказнай за запаўненне і актуалізацыю звестак аб аб’екце ацэнкі, упаўнаважаным дзяржаўным органе і арганізацыі, маніторынг якасці аказання паслуг і (ці) ажыццяўленне адміністрацыйных працэдур (у выпадку калі такіх асоб некалькі — указваюцца пасада, адрас электроннай пошты і кантактны тэлефон кожнай з іх)

Пасля рэгістрацыі на партале рэйтынгавай ацэнкі аб'ектам ацэнкі ўпаўнаважаным дзяржаўным органам і арганізацыяй забяспечваецца ўнясеннем звестак у іх асабістыя электронныя кабінеты у адпаведнасці з раздзелам 3 Інструкцыі

Пры гэтым аб’ект ацэнкі, упаўнаважаны дзяржаўны орган і арганізацыя становяцца **даступнымі для прагляду і ацэнкі грамадзянамі** на партале рэйтынгавай ацэнкі **толькі пасля ўнясення** ў асабісты электронны кабінет звестак пра іх **месца знаходжання і сферу (ы) жыццядзейнасці**, у якіх яны аказваюць паслугі, ажыццяўляюць адміністрацыйныя працэдуры.

Фарміраванне лакальных рэестраў аб’ектаў ацэнкі ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі. У сувязі з гэтым у арганізацыйна-распарадчых дакументах, накіраваных на рэалізацыю пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2019 г. № 765 у сістэме ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа (арганізацыі), мэтазгодна прадугледзець неабходнасць паведамлення аб’ектамі ацэнкі дадзенага ўпаўнаважанага органа (арганізацыі) пасля рэгістрацыі на партале рэйтынгавай ацэнкі шляхам накіравання інфармацыі па форме, указанай у дадатку да Інструкцыі

Сфарміраваныя лакальныя рэестры аб’ектаў ацэнкі **зацвяржаюцца** ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі і **накіроўваюцца** аператару парталу рэйтынгавай ацэнкі.

Аператар парталу рэйтынгавай ацэнкі на падставе атрыманых лакальных рэестраў аб’ектаў ацэнкі ажыццяўляе размежаванне ўзроўня доступу ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў і арганізацый да інфармацыі на партале рэйтынгавай ацэнкі.

Пасля гэтага ўпаўнаважаным дзяржаўным органам і арганізацыям прадстаўляецца доступ (магчымасць прагляду інфармацыіі аб ацэнках і каментацыях грамадзян) да тых аб’ектаў ацэнкі, якія ўваходзяць у сфарміраваныя і зацвержаныя імі лакальныя рэестры аб’ектаў ацэнкі.

Такім чынам, сістэмна пабудаваная і якасна праведзеная работа па фарміраванню лакальнага рэестра аб’ектаў ацэнкі, а таксама дакладнае і карэктнае ўнясенне інфармацыі аб’ектамі ацэнкі ў асабістых кабінетах дазволіць ўпаўнаважанным дзяржаўным органам і арганізацыям мець у асабістым электронным кабінеце інфармацыю аб якасці абслугоўвання насельніцтва і ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур у адносінах усіх падначаленых (якія уваходзяць у склад, сістэму) арганізацый.

Пры гэтым функцыянал парталу рэйтынгавай ацэнкі прадугледжвае, что ацэнкі. Атрыманныя структурнымі падраздзяленнямі дзяржаўнага органа (арганізацыі), а таксама аб’ектамі ацэнкі, уключаннымі ў іх лакальныя рэестры аб’ектаў ацэнкі ўплываюць на пазіцыю рэйтынга гэтых дзяржаўных органаў (арганізацый).

Пунктам 13 Палажэння ўстаноўлена, што ўпаўнаважаныя дзяржаўныя органы і арганізацыіі **не радзей за адзін раз у паўгоддзе** ажыццяўляюць **маніторынг і аналіз эфектыўнасці дзейнасці аб’ектаў ацэнкі**, уключаных ў іх лакальны рэестр аб’ектаў ацэнкі, адсочваюць атрыманыя імі ацэнкі, а таксама змяненні іх пазіцыіі ў рэйтынгу аб’ектаў ацэнкі

Па выніках правядзення маніторынгу і аналізу эффектыўнасці дзейнасці аб’ектаў ацэнкі накіроўваюцца рэкамендацыі аб прыняцці мер, накіраваных на павышэнне якасці абслугоўвання насельніцтва і (або) ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур.

Пры гэтым упаўнаважаныя дзяржаўныя органы і арганізацыі маюць права запытваць у аб’ектаў ацэнкі, уключаных у іх лакальны рэестр аб’ектаў ацэнкі, інфармацыю аб выкарыстанні партала рэйтынгавай ацэнкі, пазіцыі ў рэйтынгу аб’ектаў ацэнкі, а таксама аб мерах, якія прымаюцца для павышэння якасці абслугоўвання насельніцтва.

У адпаведнасці з Дырэктывай № 2 для эфектыўнага ўкаранення сістэмы рэйтынгавай ацэнкі таксама неабходна забяспечваць **належны ўлік інфармацыі** аб якасці паслуг, якія аказваюцца і (або) адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца, выкарыстанне гэтай інфармацыі пры ацэнцы дзейнасці адпаведных арганізацый, а таксама пры правядзенні ратацыі іх кіруючых кадраў.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2019 г. № 765 унесена дапаўненне ў Палажэнне аб парадку функцыянавання інтэрнэт-сайтаў дзяржаўных органаў і арганізацый, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 красавіка 2010 г. № 645. Згодна з гэтым дапаўненнем на галоўнай старонцы інтэрнэт-сайтаў дзяржаўных органаў і арганізацый размяшчаецца інфармацыя аб функцыянаванні партала рэйтынгавай ацэнкі, якая ўключае спасылку на яго (якасць-паслуг.бел).



З гэтай мэтай распрацаваны відэаролік пра яго. Гэтыя матэрыялы можна выкарыстоўваць для папулярызацыі партала рэйтынгавай ацэнкі, інфармавання насельніцтва аб магчымасцях яго выкарыстання, а таксама размяшчаць на афіцыйных інтэрнэт-сайтах дзяржаўных органаў і арганізацый, у іх акаўнтах у сацыяльных сетках і ў месцах абслугоўвання насельніцтва.

Source URL:
https://mpt.gov.by/paradak-vykarystannya-partala-reytyngavay-acenki-dzyarzhaunymi-organami-i-arganizacyyami